**Слова** – гэта найменшая самастойная адзінка мовы, якая складаецца з аднаго гука або граматычна афармленага гукавога комплексу, які мае значэнне і служыць сродкам моўных зносін. У навуцы вядома звыш 70 крытэрыяў вылучэння слова. Сярод іх вызначаюцца асноўныя крытэрыі: графічны (слова пазіцыянуецца як паслядоўнасць літар паміж прабеламі); фанетычны (для слова характэрны адзіны націск, гармонія галосных, пэўныя змены гукаў, адлучанасць паўзай ад іншых слоў); марфалагічны (у слове ёсць характэрная паслядоўнасць марфем: прыстаўка, корань, суфікс, канчатак); семантычны (прадмет аб’ектыўнай рэчаіснасці і яго назва звязаны паміж сабой праз семантыку слова); сінтаксічны (слова – найменшая частка сказа або мінімальная сінтаксічная адзінка). Кожны з гэтых крытэрыяў мае недакладнасці, і толькі ў сукупнасці яны дапаўняюць адзін аднаго і ствараюць аснову для разумення сутнасці слова.

Асноўнымі прыметамі слова з’яўляюцца фанетычная аформленасць, семантычная валентнасць, непранікальнасць, адзіны націск, лексіка-семантычная аднесенасць, пастаянства гучання і значэння, узнаўляльнасць, цэласнасць і адзінааформленасць, пераважнае ўжыванне ў спалучэннях слоў, ізаляванасць, намінатыўнасць.

Значэнне слова (унутраны сэнс, план зместу) звязана з прадметам абазначэння і з паняццем. Значэнне адлюстроўвае разнастайнасць свету, якая выражаецца ў выглядзе сувязі гучання слова (формы) і яго сэнсавай суаднесенасці (зместу). Самастойнае (паўназначнае) слова заўсёды мае рэальны змест, або лексічнае значэнне. Лексічнае значэнне – гэта суаднесенасць слова з адпаведным паняццем, з’явай ці аб’ектам рэчаіснасці. Так, лексічнае значэнне слова «радзіма» можна вызначыць як ‘краіна, якая гістарычна належыць пэўнаму народу і якую гэты народ насяляе; бацькаўшчына’. У словах службовых часцін мовы лексічнае значэнне рэалізуецца пры ўжыванні з самастойным словам. Асноўнай функцыяй самастойных (паўназначных) слоў з’яўляецца намінатыўная (ад лац. «nomen» ‘імя, назва’), або назыўная. Яе сутнасць у тым, што лексічныя адзінкі называюць пэўную з’яву аб’ектыўнай рэчаіснасці. Лексічнае значэнне слова ўключае кампаненты: дэнататыўны, або прадметны; сігніфікатыўны, або паняційны; структурны; прагматычны.

Роля дэнататыўнага кампанента найперш праяўляецца ў словах са значэннем прадметнасці: «гарадзішча» ‘месца, дзе захаваліся астаткі старажытнага пасялення’; «запальнічка» ‘кішэнная машынка для здабывання агню’; «калатоўка» ‘прылада ў выглядзе палачкі з сучкамі на ніжнім канцы для збівання масла, размешвання чаго-небудзь’.

Сігніфікатыўны, або паняційны, кампанент вызначаецца адносінамі слоў да сігніфікатаў – абазначаемых імі паняццяў. Сігніфікатыўны кампанент уяўляе сабой абстрактную частку зместу значэння і пераважае ў словах адцягненага зместу: «дабрадзейнасць» ‘маральныя якасці, учынкі дабрадзея; дабрачыннасць’; «задавальненне» ‘прыемнае пачуццё ад паспяховага ажыццяўлення, завяршэння чаго-небудзь’; «індывідуалізм» ‘імкненне да праяўлення сваёй асобы’.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Структурны кампанент уключае парадыгматычныя і сінтагматычныя адносіны. Парадыгматычныя рэалізуюцца на этапе намінацыі пры пошуку альтэрнатыўнага абазначэння і маюць разнавіднасці: 1) родава-відавыя: «кветка – ружа», «чалавек – мужчына»; 2) сінанімічныя: «падарожнік – вандроўнік», «шчасце – фартуна». Сінтагматычныя адносіны выяўляюцца лінейна, у маўленчым аспекце і сведчаць пра спалучальныя магчымасці слова, або яго валентнасць. Так, з прыслоўем «акуратна» спалучаюцца дзеясловы «рабіць», «пісаць», а з прыметнікам «басаногі» – назоўнікі «хлопчык», «дзяўчынка», «дзіця»).

Прагматычны кампанент характарызуе слова праз адносіны да яго зместу носьбітаў пэўнай мовы. Ён уключае канататыўны кампанент значэння. Канатацыя (ал лац. «con» ‘разам’ і «notatio» ‘абазначэнне’) – дадатковыя семантычныя або стылістычныя адценні да асноўнага лексічнага значэння. У канататыўны кампанент уваходзяць ацэначныя і эмацыянальна-экспрэсіўныя элементы значэння. Ацэначныя элементы рэалізуюцца ў такіх, напрыклад, словах: «прайдзісвет», «лежабока», «ветрагон», эмацыянальна-экспрэсіўныя – у словах «лагодненька», «малюпасенькі», «зладзюга»).

Па граматычных законах мовы кожнае самастойнае слова можа звязвацца з іншымі словамі – у гэтым выпадку яно мае не толькі лексічнае, але і граматычнае значэнне.

*Т.Я.Старасценка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ